View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Канцэпт *дому* ў творах Якуба Коласа

Цікавасць сучаснага літаратуразнаўства да прозы Якуба Коласа выклікана не толькі яго прыналежнасцю да “спакойнай” класічнай традыцыі, якая цесна звязана з нацыянальным характарам беларуса, але і здольнасцю агаляць эпіцэнтры нацыянальных трагедый. Крыштальная яснасць пісьменніцкага стылю зусім не азначае лёгкую даступнасць яго ўспрыняцця. Спадчына Коласа заражае чытача не толькі маральна-этычным максімалізмам, верай, чысцінёй, яна раскрывае ўнутраную неабароненасць і ранімасць чалавека наогул, у тым ліку і чалавека сённяшняга. Творы пісьменніка напоўнены абстрактным пачуццём каштоўнасці быцця, асабліва яго духоўным зместам. Негераічнае штодзённае жыццё ў Коласа, як аказалася, зусім не прыніжае чалавека, а выяўляе той духоўны бок быцця, які шчыльна спалучаны з найвышэйшай духоўнасцю.

Слова *канцэпт*, вынесенае ў загаловак, азначае сэнсавае напаўненне паняцця, складнікамі якога з'яўляюцца як індывідуальнае, так і агульнае, што збліжае паняцце *канцэпт* з мастацкім вобразам, які спалучае ў сабе абагульненыя і канкрэтна-пачуццёвыя моманты. Літаратуразнаўства, выкарыстоўваючы тэрмін *канцэпт* як адзінку аналізу, набывае магчымасць уключыць вобразную сістэму твора ў агульнанацыянальны асацыятыўна-вербальны кантэкст. Мастацкі твор пры гэтым здольны выявіць свае схаваныя сімвалічныя сэнсы, ажыццявіць асацыятыўны “выхад” на гістарычныя, геапалітычныя, этнапсіхалагічныя аспекты за межамі твора.

Канцэпт *дому* фундаментальны для ўсёй творчай спадчыны мастака, ён абумовіў пэўную мадэль будовы *дому*-душы, *дому* сямейнага і дзяржаўнага. *Дом*-душы служыў падмуркам сям'і, а сямейны *дом* успрымаўся Коласам як частка *дому* дзяржаўнага. Мастацкае асэнсаванне канцэпту *дому* было прынцыпова важным для пісьменніка, бо ён вызначаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гісторыка-культурную, сацыяльную, духоўную сферу чалавечага быцця, закранаў глыбінныя асновы арганізацыі асобы.

Увогуле *дом* у літаратуры выступае сімвалам стабільнасці, надзейнасці, абароненасці, выклікае пачуццё далучанасці да сям'і, роду, *дом* — гэта і традыцыя, пераемнасць, народ, гісторыя, *дом* — гэта яшчэ і аснова чалавечнасці чалавека, і сімвал цэласнасці быцця. Але чалавек можа ператварыць *дом* у псіхалагічна небяспечны вобраз, па сутнасці, *дом* становіцца *антыдомам,* як гэта адбылося ў апавяданні “Хатка над балотцам”, а траўматычнае ўспрыняцце Сымонам-музыкам (паэма “Сымон-музыка”) бацькоўскага дому справакавала ўцёкі хлопчыка. Бяздомнасць Сымона, яго бадзянні па чужых дамах становяцца канцэптаўтваральнымі ва ўсіх варыянтах паэмы.

Самым важным для Коласа з'яўляецца трактоўка паняцця *дом* як **духоўнай** прасторы чалавека, якая вызначае адносіны герояў да сям'і, да народу, яго гісторыі. Апісанне дома-будынкаў досыць распаўсюджана ў пісьменніка. Прыгадаем радкі з “Новай зямлі”:

У дол упёршыся страхою,
У глыбі двара стаяла хата
І выглядала зухавата…
Як бы шляхцянка засцянкова,
Што ў дзень святы каля касцёла,
Чуць-чуць падняўшы край падола,
Так важна ходзіць з парасонам,
Спадніцай верціць, як агонам,
З дарожак пыл, пясок зганяе
І ў вочы хлопцам заглядае [3, с. 12].

А вось малюнак недагледжанай хаткі з апавядання “Хатка над балотцам”: "Калі пазіраеш здалёк на гэтую хатку, на яе адзінокую постаць і на маленькі хлевушок, што прытуліўся да яе, бы дзіця да маткі, то нейкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мімаволі ўстае вобраз пакрыўджанай жанчыны, што пайшла ўпрочкі з сяла і ў невясёлым роздуме спынілася на дарозе сярод поля. <...> Стромкая страха яе абвісла, паздзірана вятрамі, і лезе салома з яе, як валасы з галавы, апанаванай горам, клопатам, бядой-зgразотамі" [2, с. 177]. Закінутыя будынкі — гэта папрок чалавеку, які занядбаў сядзібу і ператварыў яе ў ілюзію прытулку.

Дакладнае апісанне знешняга выгляду хаткі наводзіць чытача на думку аб яе гаспадарах. Ніхто з жыхароў не меў тут удачы, зазначае Колас, бо гаспадарамі яны не былі. Хатка для іх — проста будынкі, а не *дом* у шырокім сэнсе гэтага паняцця.

У апавяданні выразна гучыць тэма *дому* сямейнага, духоўнага як *дому* ілюзорнага, лялечнага, страчанага: "Думае Алена часамі, як будзе жыць далей. Тры мясціны ёсць на свеце, дзе можна яшчэ прыпыніцца: прыгрэбнік, вёсачка і горад. Але прыгрэбнік, як паказала мінулая ноч, рэч небяспечная. У вёсачцы можна начаваць толькі зрэдку. У горадзе ў яе ёсць сваякі. Часамі яна і жыве там. Але ж усё гэта — часовыя прыпынкі, сталага месца няма" [2, с. 204 — 205].

Канцэпт *дом* непасрэдна звязаны ў творах Коласа з канцэптам *зямля*, якая, у разуменні Коласа, сімвалізуе не толькі матэрыяльны дастатак, яна арганізуе яшчэ і духоўны свет чалавека, раскрывае яго надзейнасць, сумленнасць, здольнасць умела і дбайна працаваць. Варта прыгадаць знакамітыя радкі з “Новай зямлі”:

А дзе ж той выхад? Дзе збавенне
З няволі цяжкай, з паланення?
Адзін ён ёсць: зямля, зямля,
Свой пэўны кут, свая ралля:
То — наймацнейшая аснова
І жыцця першая ўмова.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Зямля паможа і дарадзіць,

Зямля дасць волі, дасць і сілы,

Зямля паслужыць да магілы,

Зямля дзяцей тваіх не кіне,

Зямля — аснова ўсёй айчыне [3, с. 235].

Схаванай іроніяй напоўнены Коласавы лірычны роздум аб зямлі ў апавяданні “Хатка над балотцам”: "Эх, зямля! Колькі думак людскіх нячутнымі крокамі прайшло па табе, звіваючы цябе вяночкамі надзей і ружова-светлых мар аб шчасці, аб куску надзённага хлеба! Колькі нерасчытаных слоў шапацеў табе вецер шолахам збожжа, красак і травы на ўзмежках! <...> Многа нàпісаў ляжыць на табе, а ты ўсё чакаеш, калі будзе паложан на тваім улонні такі напіс, што зробіць канец калатні з-за дароў тваіх? І хто паложыць яго?..." [2, с. 185]. Безумоўна, грамадска-палітычная сітуацыя 30-х гг. XX ст. не давала магчымасці пісьменніку адкрыта выказваць свае думкі наконт права селяніна на зямлю і ўласную гаспадарку.

Разбураны *дом* у Коласа становіцца той канцэптаўтваральнай дэталлю, якая вызначае неўладкаванае светаадчуванне герояў, іх маральную некамфортнасць. Хатка над балотцам выяўляе ўсе прыкметы *антыдому*, тут пануе запусценне і галеча, і ўсе яе жыхары — фактычна бяздомныя людзі.

Адчувае сваю безпрытульнасць і Марыся, гераіня апавядання “Туды, на захад!”. Успаміны жанчыны пра дом на Беларусі яднаюць усіх сямейнікаў: “ — А дом які быў! — не можа стрымацца і Марыся: — прасторны, мураваны. На дзве палавіны быў зроблены. У ваднэй самі жылі, другую выпускалі пад школу. Цэлае вучылішча змяшчалася, шэсцьдзесят рублёў арэнды плацілі за зіму” [2, с. 158].

Анамальным бачыцца Коласу працэс разбурэння *дому-душы* настаўніка Рыгора Андрэевіча Угодніка з апавядання “Курская анамалія”:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“У яго [Рыгора Андрэевіча Угодніка — *Т.Т.*] пакойчыку было пуста, няветла і непрытульна. Дух стаяў спёрты і цяжкі. Было холадна і сыра. Пабелка на сценах размякла ад вільгаці і адвальвалася. На выступах сцен нагусцілася многа пылу. Над печчу, каля столі, цэлымі кудламі звісала павуццё, у якім гойдаўся шкілет мухі” [1, с. 372]. Побытавая дэталь сведчыць аб душэўных трывогах героя-інтэлігента наконт новага светаўладкавання. Духоўная анамалія грамадства, якое лічыць прыстойным кантраляваць сферу сямейных адносін асобы, пазбаўляць яе права выбару і адказнасці за яго, паводле думкі Коласа, будзе куды больш сур'ёзнай, чым проста бытавая неўладкаванасць.

Канцэпты *дом* і *сям'я* ў славянскай свядомасці, як вядома, цесна ўзаемазвязаны, што значна падвышае статус *дома*. Менавіта сям'я выступае арганізатарам і носьбітам духоўнага жыцця, яна ажыццяўляе сувязь чалавека з навакольным светам. Духоўны свет *дому-сям'і* ў кантэксце неспрыяльных сацыяльных фактараў XX ст. характарызуецца адсутнасцю адчування агульнага кораня паміж блізкімі людзьмі. Тэндэнцыя, на думку Якуба Коласа, вельмі небяспечная для дзяржавы, бо яна вядзе да разбурэння родавых сувязяў і дэвальвацыі гуманістычных маральных каштоўнасцей. Не выпадкова так скрупулёзна выпісвае Колас быт і ўнутраную атмасферу *дому-сям'і* Міхала з “Новай зямлі”, безпрытульнасць Сымона-музыкі (паэма “Сымон-музыка”) і яго імкненне да Ганны як магчымасць набыць падмурак для пабудовы агульнага духоўнага *дому.* У мастацкім свеце беларускага пісьменніка адбываецца сакралізацыя *дому,* здольнага супрацьстаяць знешняму хаосу.

Канцэпт *дому* асацыятыўна шматвектарны ў творчасці мастака. Ён стаў увасабленнем ідэі пошуку роднага кута. Для Коласа заўсёды была важнай знітаванасць зямлі і дому. Вобраз хаткі над балотцам (“Хатка над балотцам”), жыццёвыя перыпетыі сям'і Марысі ў чужым курскім краі (“Туды, на захад!”), разбураны сямейны дом старой пані (“Крывавы вір”),

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

татальны кантроль дзяржавы над духоўным домам чалавека (“Курская анамалія”) пагражаюць стаць рэальнай выявай катастрофы ўсёй краіны, калі тая пазбавіць чалавека яго індывідуальнай адказнасці за свой дом і зямлю.

Адасобленасць *дома і зямлі* становіцца прычынай разбураных радавых гнёздаў, тэмы не новай у беларускай літаратуры, але надзвычай актуальнай для вырашэння праблемы зямлі, дому, бацькаўшчыны. Паўнапраўным гаспадаром у сваім доме, сямейным, дзяржаўным, духоўным, паводле думкі Коласа, можна стаць, толькі будучы гаспадаром айчыны, зямлі і іх духоўнай спадчыны.

Літаратура:


1. Колас, Я. Збор твораў. У 20 т. Т. 5. Апавяданні (1906 — 1924) / Якуб Колас ; рэд. тома З.У. Драздова ; падрыхт. тэкстаў і камент. С.Я. Забродскай, К.А. Казыра, Т.Р. Строевай, А.І. Шамякінай ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. — Мінск : Беларус. навука, 2008. — 542 с.
2. Колас, Я. Збор твораў. У 20 т. Т. 6. Апавяданні (1925 — 1951), раннія празаічныя творы (1900 — 1906), пераклады (1907) / Якуб Колас ; рэд. тома С.А. Андраюк, Т.С. Голуб ; падрыхт. тэкстаў і камент. К.А. Казыра, В.У. Карачун, А.І. Шамякінай ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. — Мінск : Беларус. навука, 2009. — 574 с.
3. Колас, Я. Збор твораў. У 20 т. Т. 8. Паэма “Новая зямля” / Якуб Колас ; рэд. тома М.І. Мушынскі ; падрыхт. тэкстаў і камент. Э.А. Золавай ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. — Мінск : Беларус. навука, 2009. — 347 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ